## Запрашаем на ўрок



**Д. А. Доўгаль,** *настаўнік Славянскай гімназіі г. Бабруйска*

# НАПІСАННЕ АФІЦЫЙНЫХ ПАПЕР
## (урок развіцця маўлення, VI клас)

Мэты: стварыць умовы для засваення асаблівасцей некаторых відаў афіцыйных папер (анкеты, аб'явы, адраса на канверце); выпрацоўваць уменне складаць аб'явы, запаўняць анкеты і афармляць адрас пры адпраўцы карэспандэнцыі; выхоўваць культуру камунікатыўных зносін; садзейнічаць фарміраванню ў вучняў сучаснага светапогляду на аснове навучання пісьмоваму афармленню дзелавых папер; развіваць уменне выкарыстоўваць папярэдне набытыя веды; спрыяць актуалізацыі ведаў па тэме «Разрады назоўніка».

Абсталяванне: Беларуская мова : падруч. для 5-га кл. агульнаадукац. шк. з рус. мовай навучання / Г. М. Малажай, Л. С. Васюковіч, З. М. Кавалевіч і інш. — Мінск : НМЦэнтр, 2002; бланкі анкет (на кожнага вучня); камплекты аб'яў з недахопамі (па колькасці груп); чыстыя карткі для напісання аб'яў (на кожнага вучня); канверты для адпраўкі па Беларусі (на кожнага вучня); карткі з дамашняй задачай (на кожнага вучня).

### Ход урока

**I. Арганізацыйны момант.**

**II. Праверка дамашняга задання (франтальная).**

Настаўнік. На папярэднім уроку мы пазнаёміліся з вельмі патрэбным стылем маўлення — афіцыйным. Давайце прыгадаем, якая сфера ўжывання гэтага стылю? Якая яго асноўная мэта? Якія асноўныя формы выказванняў? Якія асаблівасці характэрны для тэкстаў афіцыйнага стылю? (*Вучні даюць адказы на ўсе пытанні.*) Дома вы пераклалі на беларускую мову сказ з практыкавання 192, як ён загучаў? (*Уменне скласці дзелавую паперу, уменне ўдумліва чытаць, правільна разумець, тлумачыць дакументы — якасці, неабходныя для сучаснага чалавека.*)

**III. Слова настаўніка (пастаноўка мэт).**

Настаўнік. Сёння на ўроку мы якраз будзем выпрацоўваць такія якасці і навучымся ствараць некаторыя дакументы — анкету, аб'яву, адрас. Безумоўна, уменне правільна разумець і ў пісьмовай форме складаць афіцыйныя паперы важнае, але ці толькі яно патрэбна сучаснаму чалавеку? Напэўна, не. Што яшчэ павінен ведаць і ўмець сучасны чалавек? (*Вучні даюць адказы, якія, як правіла, заснаваны на ўсведамленні важнасці найноўшых дасягненняў навукі і тэхнікі.*) Але не будзем рабіць канчатковых высноў, на ўсё свой час. А цяпер пазнаёмімся з экспертамі па агульных і ўласных назоўніках. Да шаноўных экспертаў мы будзем звяртацца на ўроку па дапамогу.

Эксперт па агульных назоўніках з дапамогай слоўнікаў падрыхтуе інфармацыю аб значэнні і правапісе такіх патрэбных на ўроку слоў, як *анкета, аб'ява, пошта, карэспандэнцыя, ліст, паштоўка, канверт,*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*індэкс, адрас, адрасат, адрасант, вуліца, завулак, кватэра (можна сюды ўключыць і назвы месяцаў, якія спатрэбяцца пры запаўненні анкет),* і ў выпадку патрэбы будзе паведамляць яе аднакласнікам. Эксперт па ўласных назоўніках разам з настаўнікам перад урокам удакладніць напісанне па-беларуску ўсіх імёнаў, прозвішчаў, імёнаў па бацьку (у назоўным і давальным склонах) аднакласнікаў, а таксама запіша па-беларуску ўсе вуліцы, на якіх вучні пражываюць. Вынікам працы эксперта стане падрыхтаваная для кожнага вучня інфармацыя, напр.:

| |
|---|
| Н. Бяляўскі Юрась Вітальевіч,<br>Д. Бяляўскаму Юрасю Вітальевічу.<br>Вул. Інтэрнацыянальная, д. 57, кв. 19. |

**IV. Асноўная частка ўрока.**

1. Запаўненне анкет (індывідуальны этап).

Вучні запаўняюць адну з рознакаляровых анкет (*гл. дадатак 1*) пасля абмеркавання іх асаблівасцей і вызначэння сітуацый, дзе яны могуць выкарыстоўвацца. Апошнія пытанні ў анкетах адрозніваюцца, таму іх умоўна можна назваць «журналісцкая» (кожны клас звычайна падпісваецца на якое-небудзь выданне: часопісы «Вясёлка», «Лесавік» і г. д. — таму запаўненне такой анкеты дазволіць выкарыстаць гэту інфармацыю), «народна-песенная» (з мэтай актуалізацыі звестак, атрыманых на ўроках літаратуры пры вывучэнні народнай паэзіі), «замежная» (падкрэсліваецца важнасць вывучэння замежных моў у гімназіі), «спартыўная» (няглішняя згадка пра здаровы лад жыцця), «прыказкавая» (дае магчымасць узгадаць засвоеныя выслоўі, яшчэ раз звярнуцца да народнай мудрасці). Колькасць відаў анкет павінна адпавядаць колькасці груп, якую настаўнік хоча сфарміраваць. Тэматычную скіраванасць анкет настаўнік можа мяняць у адпаведнасці са сваімі мэтамі, з улікам асаблівасцей класа. Калі настаўнік не ставіць перад сабой мэты арганізаваць на канкрэтным уроку творчае ўзаемадзеянне між вучнямі, прысвяціць час развіццю іх вуснага маўлення, то ён можа не задаваць апошнія пытанні ў анкеце і не дзяліць клас на групы, а засяродзіцца на выпрацоўцы ўменняў, звязаных з афармленнем дзелавых папер. Хаця трэба адзначыць, што апошнія пытанні анкеты спрыяюць актуалізацыі ведаў па тэме «Разрады назоўніка» (вучні пры адказах выкарыстоўваюць, а пры аналізе ўзгадваюць назоўнікі агульныя і ўласныя, канкрэтныя і абстрактныя).

2. Гурткі аднадумцаў (групавы этап).

Настаўнік просіць вучняў аб'яднацца ў групы ў адпаведнасці з колерам анкеты.

Настаўнік. Паглядзіце ўважліва на свае анкеты. Ці толькі колер іх аб'ядноўвае? Кожная група мае свае адметныя апошнія пытанні. Як мы даведаліся, анкеты часта выкарыстоўваюцца пры прыёме куды-небудзь — на працу, напрыклад. І таму ўявіце, што гэта анкеты нейкіх гурткоў, якія існуюць ці маглі б існаваць у нашай школе. Прыдумайце, калі ласка, чым мог бы займацца такі гурток, як яго назваць і якое мерапрыемства з яго дапамогай можна правесці ў нашай школе.

Вучні абмяркоўваюць анкеты, фарміруюць «гурткі», прыдумваюць мерапрыемства, якое магла б правесці іх група, — пасяджэнне клуба «Паліглот», выпуск класнай газеты на беларускай мове, фестываль народнай песні, дзень здароўя і г. д. Вынікі абмеркавання прадстаўнікі груп прэзентуюць усяму класу.

3. Аб'явы з недахопамі (групавы этап).

Настаўнік. Вы прыдумалі цікавыя мерапрыемствы і захацелі запрасіць на іх сваіх сяброў, гімназістаў, настаўнікаў. Як гэта зрабіць найлепшым чынам? (*Вучні сярод прапанаваных варыянтаў згадваюць аб'яву.*) А каб стварыць правільную аб'яву, трэба ведаць некалькі сакрэтаў. Вы атрымалі набор з трох аб'яў, у кожнай з якіх ёсць нейкі недахоп, якога няма ў дзвюх іншых. Калі вы высветліце, што гэта за недахопы, то зразумееце, як правільна афармляецца аб'ява.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вучні ў групах параўноўваюць аб'явы (*гл. дадатак 2*), вызначаюць, што ў аб'яве службы пракату кінатэатра няма інфармацыі, ***калі*** адбудзецца падзея; у паведамленні кампаніі мабільнай сувязі — ***дзе*** пройдзе прэзентацыя; а з аб'явы «Чырвонага харчавіка» нельга зразумець, ***што*** адбудзецца. На падставе зробленых назіранняў вучні фарміруюць уяўленне пра структуру, змест аб'явы як жанру афіцыйнага стылю і вусна выпраўляюць недахопы ў прапанаваных аб'явах.

**4.** Мая аб'ява (індывідуальны этап).

Настаўнік. А цяпер, калі вы ведаеце, як пішацца аб'ява, вы можаце самі стварыць аб'яву пра запланаванае вашай групай мерапрыемства. (*Вучні на чыстых картках складаюць аб'явы.*)

**5.** Размінка «Усе мы шпарка клеім маркі».

Для вучняў шостага класа варта рэгулярна на ўроках праводзіць актыўныя хвілінкі, а настаўнік беларускай мовы зацікаўлены ў тым, каб хвілінка была не толькі актыўнай, але і карыснай для прадмета, для пазнання мовы. Тым больш, што дэкламацыя нейкага верша дазваляе хутчэй засвоіць новыя словы, націск у праблемных словах і г. д. Для размінкі на дадзеным уроку можна прапанаваць наступны верш, дэкламацыю якога трэба суправаджаць рухамі.

Усе мы шпарка
Клеім маркі!
На калені і на спіну,
На жывот і на чупрыну,
На руку і на нагу —
Усюды клеіць я магу.

**6.** Падпісваем канверты (індывідуальны этап).

Настаўнік. Клеіць маркі на канверты мы ўжо ўмеем, засталося толькі навучыцца падпісваць адрас на карэспандэнцыі, якую мы адпраўляем.

На гэтым этапе ўрока неабходны ўдзел эксперта па агульных назоўніках, які зверне ўвагу на правапіс слоў *адрас*, *індэкс*, растлумачыць значэнне слоў *адрасат*, *адрасант*.

Вучні ўстанаўліваюць асаблівасці запаўнення адраса на канверце праз аналіз практыкавання 193 і сапраўдных канвертаў. Пасля гэтага дзеці запаўняюць на канвертах радкі *КАМУ* і *КУДЫ* (вучні ўносяць сваё імя і свой адрас), карыстаючыся інфармацыяй, падрыхтаванай экспертам па ўласных назоўніках.

**V. Адпраўка лістоў (падвядзенне вынікаў урока).**

**1.** Вучні фарміруюць «пакет дакументаў»: анкета + аб'ява + канверт — і перадаюць яго настаўніку, які пасля праверкі выкананых заданняў і выстаўлення адзнакі вышле гэтыя канверты вучням па пошце.

**2.** Выстаўленне адзнак вучням-экспертам і вучням, якія актыўна выступалі на ўроку.

**3.** Рэфлексійная гутарка «Сёння на ўроку».

- Як вы адчувалі сябе на ўроку?
- Які самы яркі момант урока? Самы напружаны момант?
- Якую лексічную/арфаграфічную карысць прынёс урок?
- Пра што новае вы даведаліся на ўроку?
- Што вы навучыліся рабіць?
- Чым гэты ўрок быў карысны для вас?
- Ці змянілася ваша думка наконт характарыстыкі сучаснага чалавека?

Па апошнім пытанні настаўнік у заключным слове можа адзначыць, што сучасным чалавекам можна назваць таго, хто мае трывалыя веды і навыкі, умее весці дыялог з людзьмі і працаваць з інфармацыяй, валодае замежнымі мовамі і пры гэтым паважае і ведае духоўную спадчыну свайго народа.

**VI. Дамашняе заданне.**

Рознаўзроўневая комплексная дамашняя задача (*дадатак 3*) дазволіць замацаваць набытае на ўроку ўменне афармляць адрас на паштовай карэспандэнцыі і сфарміраваць папярэдняе ўяўленне аб праблемах, звязаных са скланеннем назоўнікаў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

## Дадаткі

*Дадатак 1*

### Анкеты (*адрозніваюцца колерам*)

**Анкета «журналісцкая»**

1. Прозвішча ______
2. Імя ______
3. Імя па бацьку ______
4. Ваша навучальная ўстанова, клас ______
5. Ваша дата нараджэння ______
6. Запішыце назвы 2—3 беларускамоўных газет ці часопісаў ______

______

7. Закончыце сказ: *Сапраўднаму журналісту патрэбны наступныя якасці:* ______

______

**Анкета «замежная»**

1. Прозвішча ______
2. Імя ______
3. Імя па бацьку ______
4. Ваша навучальная ўстанова, клас ______
5. Ваша дата нараджэння ______
6. Назавіце 2—3 краіны, у якіх гавораць на тых замежных мовах, якія вы вывучаеце ў гімназіі ______
7. Закончыце сказ: *Замежныя мовы трэба вывучаць, каб* ______

______

**Анкета «народна-песенная»**

1. Прозвішча ______
2. Імя ______
3. Імя па бацьку ______
4. Ваша навучальная ўстанова, клас ______
5. Ваша дата нараджэння ______
6. Назавіце 2—3 моўна-выяўленчыя сродкі, якія сустракаюцца ў народных песнях

______

7. Закончыце сказ: *Народныя песні патрэбныя сучаснаму чалавеку, таму што*

______

**Анкета «прыказкавая»**

1. Прозвішча ______
2. Імя ______
3. Імя па бацьку ______
4. Ваша навучальная ўстанова, клас ______
5. Ваша дата нараджэння ______
6. Запішыце якую-небудзь прыказку, у якой ужываюцца назоўнікі ______

______

7. Закончыце сказ: *У прыказках ухваляюцца такія станоўчыя чалавечыя якасці, як* ______

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Анкета «спартыўная»**

1. Прозвішча ____________________
2. Імя ____________________
3. Імя па бацьку ____________________
4. Ваша навучальная ўстанова, клас ____________________
5. Ваша дата нараджэння ____________________
6. Якія віды спорту падабаюцца вам найбольш (назавіце 2—3) ____________________
____________________
7. Закончыце сказ: *Спорт выхоўвае ў нас наступныя якасці:* ____________________
____________________

*Дадатак 2*

**Аб'явы з недахопамі**

**Аб'ява**

17 лістапада а 14-й гадзіне вучні шостых класаў Славянскай гімназіі запрашаюцца ў фірменную краму ААТ «Чырвоны харчавік».

*Адміністрацыя крамы*

**Аб'ява**

У вялікай зале кінатэатра «Таварыш» адбудзецца паказ анімацыйнага фільма «Шрэк». Запрашаюцца ўсе жадаючыя.

*Служба кінапракату кінатэатра*

**Аб'ява**

25 лістапада 2006 года а 17-й гадзіне адбудзецца прэзентацыя новага тарыфу мабільнай сувязі «Школьны».

*Рэкламны аддзел кампаніі МТС*

*Дадатак 3*

**Дамашняе заданне**

Уявіце, што вам трэба адправіць 10 лістоў вашым сябрам. Іх завуць Лера, Вольга, Надзя, Янка, Данута, Жэня (дзяўчынка), Жэня (хлопчык), Яраслаў, Алесь, Антоніо. А прозвішчы ва ўсіх розныя, але ўсе ўтвораны ад прыгожых беларускіх (у рускай мове такіх няма!) слоў. Жывуць вашы сябры ў розных гарадах Магілёўскай вобласці на вуліцах, названых імёнамі беларускіх пісьменнікаў.

Запоўніце, калі ласка, на ўсіх канвертах радкі:

КАМУ ____________________

КУДЫ ____________________

***Узор выканання.*** КАМУ: Вясёлкінай Леры; КУДЫ: г. Слаўгарад, вул. Якуба Коласа, д. 10.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова